# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І УЛАДЗІМІР ПІЧЭТА

У апошнія гады выдадзены шэраг цікавых матэрыялаў пра жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры, у тым ліку энцыклапедыя "Максім Багдановіч". Аднак сярод менш асветленых праблем творчасці застаецца тэма *Максім Багдановіч як гісторык беларускай культуры*. Яна раскрывае малавядомыя старонкі такога кароткага жыцця генія беларускай паэзіі.

Супрацоўніцтва М. Багдановіча з рэдакцыяй газеты "Наша Ніва" спрыяла паглыбленню інтарэсу паэта да гісторыі Беларусі. Ёсць усе падставы меркаваць, што менавіта з 1911 г. паэт зацікавіўся і даследаваннямі расійскага гісторыка Уладзіміра Пічэты. Хутчэй за ўсё, ён быў добра знаёмы з працай У. Пічэты "Літоўска-польскія уніі і адносіны да іх літоўска-рускай шляхты", "Літоўска-руская дзяржава", "Гедымін", "Гістарычны нарыс славянства", "Драма балгарскага народа", "Гістарычны лёс Сербіі" і іншымі, яго рэцэнзіямі на кнігі па гісторыі Заходняй Русі.



**Уладзімір Пічэта.**

І вось у снежні 1915 г. 24-гадовы Максім Багдановіч прыязджае ў Маскву, дзе сустракаецца з прыват-дацэнтам Уладзімірам Пічэтам, які ў лютым 1911 г. на знак пратэсту супраць рэакцыйнай палітыкі міністра народнай асветы Расіі Л. Касо пакінуў Маскоўскі ўніверсітэт і працаваў у Практычнай акадэміі камерцыйных навук.

На вечары памяці М. Багдановіча, які адбыўся ў БДУ 3 снежня 1922 г., У. Пічэта ва ўступным слове сказаў, што сем гадоў таму, калі ён працаваў яшчэ ў Маскоўскім універсітэце (на самай справе, у Практычнай акадэміі камерцыйных навук. – ***Э. І.***), да яго звярнуўся малады студэнт з просьбай дапамагчы распаўсюджванню сярод маскоўскіх беларусаў і прагрэсіўнага маскоўскага грамадзянства думкі аб падтрымцы культурна-нацыянальнага руху на Беларусі. Гэты малады студэнт быў Максім Багдановіч [4].

А вось што ўспамінаў пра гэтую сустрэчу У. Пічэта ў чэрвені 1923 г. на іншым вечары памяці М. Багдановіча, праз шэсць з паловай месяцаў пасля папярэдняга выступлення: "*У снежні 1915 года ў маёй кватэры зазваніў званок. Я адчыніў дзверы і ўбачыў маладога студэнта. Гэта быў Максім Багдановіч – студэнт Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя. Ён звярнуўся да мяне з просьбай аб дапамозе ў вывучэнні гісторыі роднага краю... Ён быў прадстаўніком тых, на сцягу якіх было напісана: адраджэнне нацыянальных культур...*" [5].

На жаль, сам М. Багдановіч не паспеў пакінуць успамінаў пра сустрэчу з У. Пічэтам, які стаў потым першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, адным з ініцыятараў стварэння Інстытута беларускай культуры і Беларускай акадэміі навук, акадэмікам АН СССР і АН БССР.

За год да сустрэчы з Уладзімірам Іванавічам, у ліпені 1914 г., М. Багдановіч напісаў артыкул "Беларускае адраджэнне", надрукаваны ў першым і другім нумарах часопіса "Украинская жизнь" за 1915 г. (выходзіў у той час у Маскве на рускай мове). Вельмі важна, што ў гэтым даследаванні М. Багдановіч даў перыядызацыю нацыянальна-вызваленчага руху на працягу XIX – пачатку XX ст. На яго думку, дарэформенны этап звязаны з ростам антыпрыгонніцкіх настрояў сярод часткі мясцовай шляхты і ажыўленнем лакальнага, "краёвага" патрыятызму, нараджэннем пераважна ў асяроддзі спаланізаванай інтэлігенцыі новай беларускай літаратуры (Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, У. Сыракомля, А. Кіркор, А. Вярыга-Дарэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч).

Парэформенны этап (пачатак 1860-х – 1890-я гг.) адзначаны сацыяльна-палітычным выбухам падчас паўстання 1863 – 1864 гг., з'яўленнем беларускага нелегальнага друку ("Мужыцкая праўда" К. Каліноўскага), нараджэннем народніцка-сацыялістычнага руху

(група "Гоман"), паглыбленнем навуковага вывучэння Беларусі, творчасцю Ф. Багушэвіча, які *"бадай ці не першы стаў прапаведнікам усебаковага нацыянальнага адраджэння беларусаў, даводзячы, што яны прадстаўляюць асобны самастойны народ"* [1, с. 229 – 230].

Тлумачачы тэзіс пра самастойнасць беларускай культуры, М. Багдановіч разважае так: *"Бегло выбирая и суммируя факты, по своей общепризнанности спору не подлежащие, мы убеждаемся, что белорусская культура отнюдь не является простым вариантом культуры великорусской. Наоборот, в их лице перед нами находятся два самостоятельных культурных комплекса, с самого начала росших и развивавшихся независимо друг от друга..."* [1, с. 215].

Прыемна здзіўляе манера доказу М. Багдановічам свайго пункту погляду. Ён адзначае, што да канца XIII ст. беларуская народнасць у асноўных рысах ужо сфарміравалася, апярэдзіўшы народнасць велікарускую, якая, такім чынам, не магла аказваць уплыў на працэс яе ўзнікнення. М. Багдановіч акцэнтуе ўвагу на тым, што адсутнасць эканамічных сувязей, геаграфічныя ўмовы – усё гэта пакідала яшчэ менш месца для якога-небудзь узаемадзеяння.

Нарэшце, лічыць Максім Адамавіч, у тым жа XIII ст. беларусы і велікарусы падышлі да дзяржаўнага раздарожжа, што яшчэ больш адасобіла іх. Беларусь цалкам апынулася ў межах Вялікага Княства Літоўскага, а велікарускія вобласці згрупаваліся вакол Масквы. З гэтага часу, падкрэслівае М. Багдановіч, жыццё абодвух народаў, як і іх гістарычны лёс, надоўга страціла ўсякую агульнасць.

Максім Багдановіч імкнецца даць характарыстыку культурнага жыцця на Беларусі ў эпоху Адраджэння. Ён адзначае: *"Неудивительно поэтому, что в эпоху Возрождения общий умственный подъем, начавшийся на Западе, отразился и в Белоруссии. Ключом забила тут жизнь, шла, причудливо переплетаясь, горячая религиозная, национальная и классовая борьба, организовывались братства, бывшие оплотом белорусской народности, закладывались типографии. Учреждались школы с неожиданно широкой по тому времени программой (в некоторых преподавалось пять языков), возникали высшие учебные заведения (юридическая школа имени св. Яна, полоцкая академия с правами университета и т. д.)..."* [1, с. 217].

Рэцэнзія У. Пічэты на артыкул М. Багдановіча з'явілася толькі ў 1922 г. Пад назвай "М. Багдановіч, як гісторык Беларускага адраджэньня" яна была апублікавана ў № 5-6 часопіса "Весьнік Нар. Ком. Асьв. С. Р. Р. Б.". Адразу паўстае пытанне: чаму рэцэнзія была напісана толькі праз сем гадоў? Сёння на яго цяжка адказаць. Але не трэба забывацца, што ў той час ішла Першая сусветная вайна: друкавацца было не проста. Потым адбыліся бурныя падзеі 1917 г., грамадзянская вайна.

Ёсць падставы меркаваць, што праца рэктарам Беларускага ўніверсітэта, выкладанне гісторыі Беларусі ў гэтай навучальнай установе паўплывалі на імкненне У. Пічэты паглыблена заняцца вывучэннем гісторыі беларускай культуры. І адной з першых тэм па гэтай праблеме стала вывучэнне творчай спадчыны М. Багдановіча, якога Уладзімір Іванавіч ведаў асабіста.

Водгук У. Пічэты на артыкул М. Багдановіча да сёння не страціў навуковай каштоўнасці і актуальнасці. Напачатку Уладзімір Іванавіч дае высокую ацэнку асобе М. Багдановіча і яго паэзіі. Ён заўважае: *"Сярод мнагалічбавай плеяды маладой беларускай інтэлігенцыі, аддаўшай усе свае сілы і здольнасці адраджэньню нацыянальнай культуры роднай краіны, М. Багдановіч займае адно з першых месц. Яго паэтычныя выступленньні гаварылі аб вялікай паэтычнай здольнасьці, яго паэтычныя творы, апавітыя ўнутраным лірызмам і шчырым каханьнем да роднае краіны, дазваляюць спадзявацца, што ў асобе М. Багдановіча беларускае мастацкае слова скажа шмат новага, сьвежага, выяўленага ў прыгожых паэтычных вобразах і нарысах..."*

Трэба адзначыць, што твор У. Пічэты не проста рэцэнзія на згаданы артыкул М. Багдановіча, але і крытычны разгляд шэрагу гістарычных і публіцыстычных прац паэта. Пра гэта сведчаць наступныя словы Уладзіміра Іванавіча: *"Максім Багдановіч быў верным рыцарам сваёй абяздоленай бацькаўшчыны, і не толькі адным сваім мастацкім словам: ён выступаў і як публіцыст, які ў сваіх сьцісла напісаных артыкулах імкнуўся паказаць гісторыка-культурныя асновы беларускага нацыянальна-культурнага адраджэньня. І яго артыкулы, напісаныя без усякай палітычнай прадузятасці, а належачым маладому пісьменніку прыгожствам, сведчаць сваёй аўтарытэтнасьцю аб рэальнасці нацыянальных імкненьняў беларускага народу..."* [3, с. 8 – 9].

У заключэнне У. Пічэта падкрэслівае: *"Нельга не згадзіцца з тым, што асноўныя вехі гэтага працэсу* [гісторыі беларускага адраджэння] *прадстаўлены правільна, і будучаму гісторыку прыдзецца з імі лічыцца..."*

На падставе глыбокага аналізу напісанага М. Багдановічам па гісторыі беларускай культуры У. Пічэта прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на суб'ектывізм асобных палажэнняў аўтара, агульны нарыс беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння прадстаўлены паэтам зусім выразна.

Як рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1921 – 1929 гг. У Пічэта аддаваў вялікую ўвагу прапагандзе і папулярызацыі беларускай культуры. У сувязі з гэтым прафесар БДУ М. Піятуховіч успамінаў: *“Вялікую ролю ў прапагандзе беларускай мовы адыгралі праводзіўшыяся па ініцыятыве рэктара У. Пічэты ўрачыстыя сходы, якія прысвячаліся асобным паэтам і пісьменнікам (Янку Купале, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу і інш.). На сходах рабіліся даклады аб творчасці пісьменнікаў; звычайна на іх збіралася шмат слухачоў; зала не магла ўмясціць усіх жадаючых; даклады праходзілі з вялікім уздымам і мелі велізарнае значэнне”* [2, с. 59].

Хацелася б адзначыць памылку, якую дапускаюць даследчыкі жыцця і дзейнасці як М. Багдановіча, так і У. Пічэты. Яны адзначаюць, што ў БДУ ў 1920-я гг. быў толькі адзін вечар памяці Максіма Адамавіча. На самай справе ў 1922 – 1923 гг. адбыліся два вечары памяці гэтага цудоўнага беларускага паэта.

Першы з іх праводзіўся 3 снежня 1922 г. У ім удзельнічалі рэктар БДУ прафесар У. Пічэта, лектар М. Піятуховіч, старшыня Цэнтрабелсаюза Я. Дыла і беларускі драматург У. Галубок.

Ва ўступным слове Уладзімір Іванавіч адзначыў, што М. Багдановіч слаўны для Беларусі не толькі як пясняр і пісьменнік, але і як выдатны публіцыст і крытык і ўвогуле як усебакова адукаваны чалавек. Таму смерць М. Багдановіча – надта цяжкі ўдар для беларускай культуры і для беларускага пісьменства ў асаблівасці.

На гэтым пасяджэнні рэктар БДУ зрабіў таксама асобны даклад, у пачатку якога акцэнтаваў увагу на тым, што Багдановіч-публіцыст мае велізарнае значэнне ў гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. У Пічэта заўважыў, што праз артыкулы ў розных расійскіх часопісах і газетах паэт стараўся пазнаёміць чытачоў з беларускім нацыянальным рухам і адзначыць яго месца ў гісторыі еўрапейскіх нацыянальных рухаў і еўрапейскай культуры, якая развіваецца ад агульнай сярэднявечнай культуры да шматлікіх нацыянальных культур. Адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай гістарычнай навукі падкрэсліў, што беларуская культура мае права на самастойнае існаванне, што яе гістарычнае быццё шмат чым адрозніваецца ад культуры рускай, што блізкасць Заходняй Еўропы дала беларускай культуры асобны характар і адзнаку.

У канцы даклада У. Пічэта адзначыў, што М. Багдановіч шчыра верыў у жыццёвасць і блізкі росквіт беларускага культурна-нацыянальнага адраджэння і што сучаснае становішча беларускай справы (маючца на ўвазе 1920-я гг.) спраўдзіла жаданні М. Багдановіча.

Другі вечар памяці паэта ў сценах БДУ адбыўся ў сярэдзіне чэрвеня 1923 г. Пад гукі “Інтэрнацыянала” яго адкрыў старшыня Інстытута беларускай культуры С. Некрашэвіч. Ён пазнаёміў прысутных з кароткім апісаннем жыцця М. Багдановіча і заклікаў усіх вітаць прысутнага на вечары бацьку паэта Адама Багдановіча. Зала наладзіла Адаму Ягоравічу бурную авацыю.

З аглядам навуковай працы М. Багдановіча выступіў рэктар БДУ прафесар У Пічэта. У прыватнасці, ён падзяліўся ўражаннем ад першай і апошняй сустрэчы з паэтам у Маскве ў снежні 1915 г. Уладзімір Іванавіч акрэсліў значэнне творчасці М. Багдановіча ў культурным адраджэнні: паэт раскрыў асноўныя моманты з гісторыі нацыянальнага руху ў Беларусі, вызначыў этапы ўпадку і росквіту, што мела месца ў многіх народаў, прычым галоўную ўвагу спыніў на моманце змены беларусафільства беларусазнаўствам. На думку У. Пічэты, першае месца ў беларусазнаўстве належыць М. Багдановічу. Менавіта ён даў схему культурна-нацыянальнага адраджэння, выклікаўшы добрае разуменне гістарычнага працэсу. Даследуючы гісторыю Захаду, М. Багдановіч такую самую мерку прыклаў і да гісторыі Беларусі. Гэта трэба мець на ўвазе будучым гісторыкам. М. Багдановіч не казаў, што трэба ствараць, а сам ствараў хараство мовы, літаратуры.

Прафесар У. Пічэта закончыў даклад такімі словамі: *“Ён памёр, не даўшы прастору магутным крылам. Каб жыў у сучасны момант М. Багдановіч, ён быў бы ў ліку тых беларусаў, якія чытаюць лекцыі з катэдраў БДУ...”* [5].

Уладзімір Пічэта перажыў Максіма Багдановіча на 30 гадоў. Ён стаў вучоным-славістам з сусветным імем, адным з самых вядомых і выдатных савецкіх вучоных-гісторыкаў, арыгінальным гісторыкам беларускай культуры, якога справядліва называлі гісторыкам-аналітыкам, першым і адзіным заслужаным прафесарам БССР. Таму такая важная для нас яго ацэнка творчай спадчыны Максіма Багдановіча.


**Спіс літаратуры**

1. **Багдановіч, М.** Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1968. – Т. 2.
2. **Беларускі дзяржаўны універсітэт (1921 – 1927).** – Мінск, 1927.
3. **Пічэта, У.** М. Багдановіч, як гісторык Беларускага адраджэньня / У. Пічэта // Весьнік Нар. Ком. Асьв. С. Р. Р. Б. – 1922. – Вып. 5-6.
4. **Савецкая Беларусь.** – 1922. – 6 снеж.
5. **Савецкая Беларусь.** – 1923. – 20 чэрв.



**Эмануіл ІОФЕ,**
прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук.